# Харызматычная, крэатыўная, разумная і таленавітая

## За званне найлепшай змагаліся 12 студэнтак

**Днямі ў Спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў было шматлюдна: там праходзіў фінал XXXI Міжнароднага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2022». Арганізатарамі выступілі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Расійскі саюз моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі і Нацыянальнай школы прыгажосці.**



...Апошнія музычныя рэпетыцыі перад стартам шоу, гледачы, якія паступова запаўняюць трыбуны, і канкурсанткі, што рыхтуюцца да выхаду на сцэну ў грымёрцы... А яшчэ — прыгажосць: яна літаральна лунала ў паветры. Менавіта такая атмасфера і панавала ў зале перад мерапрыемствам...

У фінальным шоу ўзялі ўдзел 12 канкурсантак: па шэсць ад Беларусі і Расіі. Трэба адзначыць, што для гэтага ім прыйшлося прайсці зусім няпросты шлях. Напрыклад, на выхад у паўфінал ад беларускага боку прэтэндавала 370 студэнтак. Адборачныя туры адбыліся ў 44 установах вышэйшай адукацыі, паўфіналы — у пяці абласных цэнтрах і Мінску. Каманда фіналістак была сфарміравана канчаткова пасля рэспубліканскага конкурсу грацыі і таленту «Каралева студэнцтва — 2022».

Пасля канцэптуальнага пралогу «Адлюстраванне сапраўднай каралевы» мы нарэшце ўбачылі саміх канкурсантак. Яны ўпэўнена дэфіліравалі па сцэне ў яркіх кактэйльных сукенках. Але ж проста знешняй прыгажосці недастаткова. Сапраўдная каралева павінна быць харызматычнай, крэатыўнай, разумнай і таленавітай. Менавіта гэтыя якасці і былі патрэбны канкурсанткам, каб годна прадставіць творчы нумар. Адным з самых яркіх стала выступленне Ганны Івановай, студэнткі трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Яна выканала народны танец на сучасны манер. Гледачы былі ў захапленні.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

# Харызматычная, крэатыўная, разумная і таленавітая

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)





Вельмі крануў нумар Веранікі Лукашэвіч, студэнткі другога курса факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Гэта была інсцэніроўка балю канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Сваё выступленне дзяўчына завяршыла невялікім маналогам:

— Ва ўсе часы любоў і прыгажосць былі тымі пачуццямі, якія, акрыляючы сэрцы людзей, дапамагалі ім у самых складаных сітуацыях. Так склалася ў маім жыцці, што я расла без бацькоў, але менавіта гэтыя пачуцці дапамаглі мне прайсці скрозь усе нягоды майго дзяцінства.

Самым незвычайным было выступленне Айыыны Пудавай, студэнткі трэцяга курса Інстытута псіхалогіі Паўночна-Усходняга федэральнага ўніверсітэта імя М. К. Амосава. Гэта было сапраўднае этнічнае шоу — з маналогам на якуцкай, завываннем звяроў і ігрой на нацыянальным інструменце. І ўсё гэта ў выкананні адной дзяўчыны.

Далей было яшчэ некалькі разнапланавых дэфіле ў нацыянальных і дзелавых касцюмах, а таксама ў вячэрніх сукенках. Усе дзяўчаты былі вельмі прыгожыя, кожнай пасаваў абраны строй.

А яшчэ ў праграме быў конкурс прамоўніцкага майстэрства «Люстэрка». Асабліва спадабалася, як гэту тэму інтэрпрэтавала Дар'я Алістрава, студэнтка другога курса факультэта мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Яна пачала сваё выступленне з таго, што ў кожнай жанчыны ёсць асаблівы мужчына, які, нібы люстэрка, паказвае яе ўнутраны свет. Магло падацца, што цяпер пачнецца рамантычны аповед, але не. Для Дар'і асаблівы мужчына — яе тата. Яна прыгадала, як ён у дзяцінстве катаў яе на шыі, як яны разам ездзілі ў лес, як бацька вучыў яе плаваць.

«Тата, твае вочы — маё люстэрка, дзякуючы табе я ўбачыла сябе сапраўднай», — гучаў голас Дар'і. Але самой дзяўчыны ўвесь гэты час не было на сцэне. Пры гэтым усе чулі яе словы і бачылі субцітры на экране. У чым справа, куды знікла канкурсантка?

Усё стала на свае месцы ў канцы нумара, калі ўсе пачулі: «Тата, павярніся, я побач». Сафіты падсвятлілі частку глядзельнай залы, і ўсе ўбачылі Дар'ю з букетам кветак, якая абдымалася са сваім бацькам.

...Самым напружаным момантам, вядома, было абвяшчэнне вынікаў: хто ж стане «Каралевай студэнцтва — 2022»? Пасля шэрагу раздадзеных узнагарод мы нарэшце даведаліся, што гэты тытул атрымала Айыына Пудава, студэнтка трэцяга курса Інстытута псіхалогіі Паўночна-Усходняга федэральнага ўніверсітэта імя М. К. Амосава. «Віцэ-каралевай студэнцтва — 2022» стала Ганна Іванова, студэнтка трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. А тытул «II Віцэ-каралева студэнцтва — 2022» падзялілі паміж сабой Арыяна Гайнуліна, студэнтка чацвёртага курса гуманітарнага факультэта Табольскага педагагічнага інстытута імя Д. І. Мендзялеева, і Паліна Шыркова, студэнтка другога курса магістратуры будаўнічага факультэта Варонежскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. А «Каралевай студэнцтва online» стала Наталля Папко, студэнтка чацвёртага курса лячэбнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**